диссертационных исследованиях О.С. Гончаровои [4] та Р.В. Шарібжанова [18], посвященных национальной политике советского правительства 1920-х годов.

Таким образом, в течение 1920-х годов было накоплено достаточное количество статистических материалов, учеными проведено их глубокое исследование. Все это создало благоприятные условия для подробного изучения, анализа и освещения этнического состава населения города Харькова.


1. Авдієнко, М. Попередні підсумки всенародного перепису 1926 року / М. Авдієнко // Знання. – 1927. – № 15–16. – С. 24–25.
2. Всесоюзная перепись населения 1926 г. Т. XI. Украинская Социалистическая республика. Итоги по республике. – М. : Издание ЦСУ Союза ССР, 1929. – 204 с.
3. Гіршфельд А. Міграційні процеси в Україні (в світлі перепису 1926 р.) / А. Гіршфельд. – Харків : Державидав «Господарство України», 1930. – 87 с.
4. Гончарова, О.С. Національні меншини Харківщини в умовах здійснення політики коренізації (20-ті – початок 30-х років XX століття): автореф. дис... канд. іст. нак. 07.00.01 – Історія України / О. С. Гончарова. – Харків, 2007. – 21 с.
5. Державний архів Харківської області.
6. Духопельников В.М. Деятельность местных органов власти Харьковщины среди национальных меньшинств в 20-30-е годы XX столетия / В.М. Духопельников // Эпоха. Культуры. Люди (история повседневности и культурная история Германии и Советского Союза. 1920-1950-е годы). Материалы международной научной конференции (Харьков, сентябрь 2003 г.) : Сб. докладов. – Харьков : Восточно-региональный центр гуманитарно-образовательных инициатив, 2004. – С. 88–100.
7. Історія міста Харкова XX століття / О.Н. Ярмиш, С.І. Посохов, А.І. Епштейн та ін. – Харків: «Фоліо», «Золоті сторінки», 2004. – 686 с.
8. Курман, М.В. Население большого социалистического города / М.В. Курман, И.В. Лебединський. – М.: Статистика, 1968. – 200 с.
9. Мінаєв С.В. Наслідки вселюдного перепису 1926 р. на Україні / С.В. Мінаєв. – Харків: Державидав України, 1928. – 92 с.
10. Наулко, В.І. Етнічний склад населення Української РСР. Статистико-картографічне дослідження / В.І. Наулко. – К.: Наукова думка, 1965. – 135 с.
11. Скоробогатов, А. Територія та населення Харківщини у 20–30 роках XX ст. / А. Скоробогатов // Березіль. – 1997. – № 11–12. – С. 132–148.
12. Смілянський Населення Харківщини / Смілянський // Вісті ВУЦВК. – 1922. – 31 серпня.
13. Смілянський. Населення Харкова в числах перепису 1920 р. / Смілянський // Вісті ВУЦВК. – 1922. – 27 жовтня.
14. Харків та інші міста і селища міського типу. – Харків, 1928. – 212 с.
15. Харьков многонациональный. – Харьков: Восточно-региональный центр гуманитарно-образовательных инициатив, 2004. – 256 с.
16. Хоменко, А. Національний склад людності УСРР / А. Хоменко. – Харків : Державне видавництво України, 1929. – 71 с.
17. Центрального державного архіву вищих органів влади й управління України.
18. Шарібжанов, Р.В. Національні меншини Харкова в 20-30-ті рр. XX ст.: автореф. дис ... канд. іст. наук : 07.00.01. – історія України / Р.В. Шарібжанов. – Харків, 2008. – 20 с.


**Бароўка В.Ю.**

## МАСТАЦКАЯ РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ГОРАДА Ў "ЗЯМЛІ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ" У. КАРАТКЕВІЧА: АКСІЯЛАГІЧНЫ ПЛАН

Уладзімір Караткевіч – натхнёны пясняр беларускага краю і яго гісторыі. "Зямля пад белымі крыламі" (1972) адрасавалася на пачатку ўкраінскім чытачам. Відаць, у сувязі з гэтым аўтар імкнуўся ў найлепшым святле прадставіць айчынныя гарады. Пра вялікія беларускія паселішчы ён расказаў у раздзеле "Камяніцы, і гмахі, і вежы", пра малыя – у раздзеле "«Вялікія» малыя гарады".

Аповед пра беларускія гарады пачынаўся раздзелам "Горад на Нямізе", дзе Караткевіч адзначыў няўхільнае павелічэнне колькасці гарадскога насельніцтва. Мінск рэпрэзентаваны горадам-героем, горадам-працаўніком. Не без горычы У. Караткевіч пісаў: "Гораду больш за 900 год. Адзін з самых ранніх успамінаў аб ім – радкі са «Слова аб палку Ігаравым»: «На Нямізе снапы сцелюць галовамі, малоцяць чапамі харалужнымі, на таку жыццё кладуць, веюць душу ад цела». Крывавыя берагі Нямігі даўно забраныя ў падземную трубу. Засталася толькі старая гандлёвая назва горада "Мінск", а ў даўніну "Менеск", "Мінск", ад слова "мена", "мяняць". І дужа мала гісторыі. Таму што ў гады апошняй вайны Мінск быў знішчаны ледзь не на сто працэнтаў, пушчан дымам і попелам. У адрозненне, скажам, ад Суздаля або ад Кіева, тут можна паказаць цікаўнаму турысту толькі некалькі старых будынкаў і храмаў XVII–XVIII стагоддзяў ды некалькі будынкаў эпохі класіцызму. Па беларускую старажытнасць трэба выязджаць далей, на правінцыю" [1, с. 461]. Мінск – горад, што пастаянна развіваецца, расце: "Можна прывесці такі прыклад. Месца расстрэлу паўстанцаў 1863–1864 гг. знаходзілася за горадам. Цяпер гэта раён галоўнага паштамта" [1, с. 461]. Каб патлумачыць, чаму горад зараз не багаты на гістарычныя помнікі, пісьменнік заўважыў: "Мінск у вайну змагаўся герaічна. Мінск герaічна ўставаў пасля вайны з попелу" [1, с. 464]. Першай сталіцай Беларусі Караткевіч лічыў Полацк, у якім даўніна цяпер засланілася сучаснасцю: "Ясна, што сівая даўніна – галоўнае, на чым стаіць гэты горад. Але яе не кожны адразу заўважыць. Затое адразу кінуцца ў вочы навічку шырокія зялёныя вуліцы, новыя дамы, карпусы завода шкловалакна і іншых шматлікіх заводаў" [1, с. 466]. Полацкая Сафія – сястра Кіеўскай і Наўгародскай: "Многае змянілася за стагоддзі,



Репозиторий БГУ

храм нібы “асеў” . У скляпах ягоных была ў свой час адна з найлепшых нашых старажытных бібліятэк. Яе спалілі ў свой час езуіты. Дзіўна! Якімі б метадамі яны ні карысталіся, як бы мы тыя метады ні ненавідзелі – манахі гэтага ордэна былі аднымі з самых адукаваных людзей Сярэднявякоўя” [1, с. 465]. Аўтар захапляўся саборам Спас-Ефрасінні з прыгожымі фрэскамі: “Калі сонца праз невялікія вокны трапляе ўнутр сабора, гэтыя фрэскі загараюцца бляклай чырванню і ржавым золатам. Нібы праз залаціста-карычневую, празрыстую ваду глядзяць на вас нечалавеча вялікія задумлівыя вочы нашых продкаў” [1, с. 465]. Як ураджэнец Віцебшчыны пісьменнік на трэцяе месца па значнасці сярод беларускіх гарадоў паставіў свой абласны цэнтр. Ён азначаў Віцебск як горад майстроў, горад-памежнік: “Вечная крэпасць, вечны фарпост на шляху заваёўнікаў. Важны гандлёвы пункт на шляху «з вараг у грэкі». Вялікі культурны цэнтр. Нездарма ў ім знойдзена так многа старажытных берасцяных грамат і надпісных праслiцаў. Жыхары Віцебска славіліся ўпартай мужнасцю і ваяўнічасцю. Удзельнічалі яны ў бітве на Няве, на Чудскім возеры, грамілі крыжаносцаў у Юр’еве, шмат разоў паўставалі супраць сваіх феадалаў” [1, с. 467]. Аднак горад праславілі не толькі ратнікі: “Менавіта тут зарадзілася сярод усходніх славян майстэрства рэльефнай, шматкаляровай кафлі (так званая «цанінная справа»). Беларускія даўнія майстры неслі яе і да суседзяў. Так, майстар Ігнат сын Максімаў з Копысі разам з сябрам Сцяпанам, сынам Іванавым з Мсціслаўля прынеслі гэту штуку нават у Маскву, дзе яны і пабудавалі, упрыгожыўшы цанінаю, такія шэдэўры, як нябесна-сіні Круціцкі церамок, некаторыя крамлёўскія палацы, будынкі ў Тройца-Сергіевай лаўры і сабор Нова-Ерусалімскага манастыра” [1, с. 467–468]. З гонарам за землякоў пісьменнік паведамляў, што майстры Віцебскага дывановага камбіната ўзнагароджаны дыпломам ў сталіцы дывановага ткацтва Дамаску. У. Караткевіч асмеліўся нагадаць і пра слынных дзеячаў мастацтва: “Віцебск – горад старых мастацкіх традыцый. Працавалі тут, у прыватнасці, Ю. Пэн, М. Дабужынскі, славуты К. Малевіч, не менш славуты М. Шагал і некалькі год І.Я. Рэпін, маёнтак якога, Здраўнёва, быў непадалёку ад Віцебска” [1, с. 468].

Кароткі нарыс пра “горад магілы льва” пачынаўся пераказам легенды пра яго паходжанне і гістарычнымі звесткамі: “Магілёў узнік на месцы старога замка ў 1267 годзе. Гісторыя яго бурная і крывавая. Напады войск, змова з казацкімі атаманамі (1590 г. – з Мацюшкам Гультаём, у 1595 г. – з Севярынам Налівайкам). Чатыры гады бунтаваў горад на пачатку XVI ст., і пасля чатыром кіраўнікам адсеклі галовы, а набатным званам выдзерлі языкі” [1, с. 469]. Караткевіч падкрэсліваў, што Магілёў заўсёды адыгрываў прыкметную ролю ў гісторыі: “На Магілёўскім падоле стаіць Мікольская царква, бліскучы ўзор беларускага барока. З ёю звязаны яшчэ адзін эпізод гісторыі. Пры ёй, у «Цярэшка, каторы проскуры заведал», жыў некаторы час у бязвестнасці сціплы школьны настаўнік Дзмітр Нагі. Тут зарадзілася яго «ідэя», тут ён пачаў яе выконваць і, магчыма, атрымоўваць інструктаж ад пэўных колаў і грамадзіць паплечнікаў. Каб пасля ўзляцець на адну з вяршынь зямной магутнасці пад імем цара Дзімітрыя, а пасля бясслаўна ўпасці з яе як Лжэдзімітрый II. Былі тут і шведы і іншая навалач – але пра гэта доўга, дый цяжка расказваць. У Вялікую Айчынную вайну горад дужа доўга (25 дзён, з 1-га па 26-га ліпеня 1941 г.) трымаўся, быў моцна разбураны, і помнікаў старажытнасці ў ім мала” [1, с. 469–470]. Адзначаў пісьменнік і ўнёсак горада ў развіццё культуры, захаванне памяці пра мінулае, значным культурным цэнтрам называў мясцовы музей.

Гомель ва ўспрыманні пісьменніка – “горад зеляніны і вады”, “горад стары (1142 г.) і дужа малады, вельмі гожы” [1, с. 471]. Славутасцю горада аўтар называў парк, закладзены ў 1780 годзе: “Сто розных парод дрэў, у тым ліку пірамідальныя дубы, гінкго, коркавае дрэва і г.д. Гроты, аранжарэі, вісячыя масты над ярамі, ператворанымі ў лебядзіныя сажалкі” [1, с. 471]. Не без гонару пералічваў помнікі архітэктуры: “Петрапаўлаўскі сабор пачатку XIX ст., гэткі Ісакій у мініяцюры (цяпер тут планетарый), магільня графаў Паскевічаў, труба яго былога завода, пабудаваная як мінарэт, з якой адкрываецца галавакружны пейзаж. І, нарэшце, класіцыстычны палац XVIII ст. Румянцаў пабудаваў, калі Екацярына II падарыла яму значную частку Гомельшчыны… 70 залаў, аздобленых карарскім мармурам, золатам, каштоўнымі пародамі дрэў, агатам” [1, с. 471]. Прыводзіў пісьменнік і мала вядомы тады большасці чытачоў факт: “У асобным крыле палаца, упрыгожаным вітражамі, была бібліятэка, якую Румянцаў пасля перавёз у Маскву. Вельмі і вельмі багатая, яна склала падмурак Румянцаўскай бібліятэкі. Цяпер гэта Дзяржаўная бібліятэка СССР імя Леніна” [1, с. 471]. Гомель для пісьменніка – увасабленне айчыннага прамысловага цэнтра.

Рэпазіторый ВДУ

Брэст характарызаваўся як "брама краіны": "Гэтая зямля спрадвеку ўсыпана магіламі, курганамі, згубленай у баі зброяй. Каго тут толькі не было?! Нават готы ў другім стагоддзі ішлі тут са сваёй туманнай поўначы да Чорнага мора, а потым, калі паўдзённыя плямёны турнулі іх, – зноў каціліся на поўнач. Археолагі выкапалі ў скарбе другога стагоддзя наканечнік дзіды з рунічным надпісам: "Наперад!". А на такім жа наканечніку чацвёртага стагоддзя, тыя ж вуглаватыя суровыя руны: "Назад!" [1, с. 474]. Брэсцкая крэпасць, паводле пісьменніка, – візітная картка горада: "Дарэчы, крэпасць ляжыць якраз на месцы таго Бярэсця, якое ўжо ў 1019 годзе ўпамінаецца як досыць вялікае пасяленне. Іменна там жылі мастакі-рамеснікі і мужныя воіны, якія ў 1241 годзе паляглі да апошняга, не здаліся манголам і тым далі магчымасць жыхарам Слуцка, Крычава і іншых гарадоў адбіцца, а пасля перайсці ў наступ і не пусціць орды Батыя на тэрыторыю будучай Беларусі. Іменна там жылі тыя, што выставілі свій полк пад Грунвальд, што біліся з Карлам XII, ішлі з косамі пад сцягі Касцюшкі" [1, с. 474]. Нарыс пра Брэст цалкам заснаваны на акцэнтаванні змагарнага духу насельнікаў горада ў даўнія часы і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

У. Караткевіч іранічна заўважыў на пачатку аповеду пра Гродна: "Упершыню яго ўпамінаюць у 1128 годзе, але гэта ўжо быў вялікі горад, што склаўся куды раней, таму што быў сталіцай удзельнага княства Гарадзенскага. Проста дзіўная манера ў нашых летапісаў і ў нашых гісторыкаў. Першае ўпамінанне аб горадзе – гэта абавязкова тое, што яго нехта ўпершыню спаліў, аб царкве – што "згарэла ад шыбення перуну". Словам, вясёлыя былі тыя часы…"[1, с. 477]. Гродна прадстае горадам таленавітых майстроў у мінулым, багатым на гістарычныя помнікі горадам: Каложская царква XII стагоддзя, Гродзенскі фарны касцёл, комплекс манастыра брыгітак, замак Стэфана Баторыя з музеем у ім, дзе "можна хадзіць гадзінамі і глядзець то на трохсотгадовае крэсла з рэльефам – крыху карыкатурным – панскай п'янкі, выразанай на спінцы; то на прадметы побыту першанасельнікаў, то нават на кубак М. Агінскага, дзядзькі аўтара славутага "Паланеза", які таксама быў кампазітарам і, у дадатак да таго, вялікім літоўскім гетманам. На ганку музея – гарматы, у свой час, патопленыя Пятром I" [1, с. 481]. Гродна пісьменнік атэставаў і старадаўнім цэнтрам вальнадумства і гуманізму: "Выдаваліся (1567 г.) брашуры, у якіх адмаўлялася ўлада, усхвалялася свабода веры, агульнасць маёмасці, прапаведвалася аддзяленне касцёла ад дзяржавы, гаварылася, што розніцы не павінна быць між каралём і народам, шляхтай і плебеямі… У Гродні жыў беларускі філосаф атэіст Кашпар Бекеш" [1, с. 479].

Да самых цікавых і "рамантычных" з малых беларускіх гарадоў пісьменнікамі аднесены Навагрудак, Нясвіж, Слонім, Мазыр, Рагачоў, Мір, Давыд-Гарадок. Навагрудак – таму, што быў калісьці "сталіцай княства Літоўскага", што з ім звязаны біяграфія і творчасць Адама Міцкевіча, што там знаходзіцца касцёл, у якім вянчаўся князь літоўскі і кароль польскі Ягайла, што паблізу возера Свіцязь. Прыгадваючы вядомую легенду пра возера, Караткевіч даваў ёй матэрыялістычнае тлумачэнне: "Чаму ў нас так многа "гарадоў на дне азёр"? Ну што ж, на Беларусі, як і ўсюды, ёсць вапнякі, а значыць, яны вымываюцца вадой, а значыць, магчымы і карставыя з'явы, правалы. Можа, некаторыя з азёр і атрымаліся так, можа, на месцы некаторых і стаялі прыбудовы. Астатняе зрабіла неўтаймоўная народная фантазія" [1, с. 486]. Слонім на беразе Шчары пісьменнік называў "цацкай", "сямісотгадовым юнаком": "Чыстая вада з зялёнымі косамі водарасцяў, што звіваюцца ад хуткасці плыні, амывае яго, бягуць угору і ўніз маляўнічыя вулачкі, бялеюць вежы. Галоўным чынам беларускае барока XVI–XVII стст., але не вычварнае і раскошнае, а простае і строгае" [1, с. 486]. Нясвіж характарызаваўся як горад-помнік, Мазыр – як міні-Кіеў, Давыд-Гарадок – як царства кветак.

Акадэмік Д.С. Ліхачоў слушна заўважаў: "Гісторыя – маці каштоўнасных меркаванняў, маці разумення, маці эстэтычнага ўспрымання твораў" [2, с. 39]. Эстэтычная рэпрэзентацыя беларускіх гарадоў у "Зямлі пад белымі крыламі" ўгрунтавана на выкарыстанні гістарычнага матэрыялу і мастацкіх абагульненняў з устаноўкай на кампліментарнасць у дачыненні да нацыянальнага кантэксту. У. Караткевіч артыкуляваў думку пра багатую гісторыю айчынных гарадоў, пра важнасць захавання гістарычнай памяці, помнікаў старадаўняй культуры, незалежна ад іх свецкага ці рэлігійнага характару. Аповед быў заснаваны на супастаўленні мінулага і сучаснага, акцэнтацыі няспыннасці жыццёвага руху, повязі мінулага і сучаснага. Мастацкая панарама гарадоў у творы – адмысловая гістарыяграфічная крыніца пра каштоўнасныя параметры горада як цэнтра ідэнтыфікацыі этнасу і яго культуры.

1. Караткевіч, У. Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1987–1991. – Т. 8. – Кн. 1. – 1990. – 591 с.
2. Лихачев, Д.С. О филологии / Д.С. Лихачев. – М. : Высш. шк., 1989. – 208 с.

Репозиторий ВГУ